


У 2027 годзе круглыя даты з моманту сваёй першай публіцацыі адзначаць многія творы беларускіх пісьменнікаў. Юбілеі – гэта не проста фармальная нагода ўзгадаць мінулае, але і магчымасць яшчэ раз асэнсаваць нашу літаратурную спадчыну і па-новаму адкрыць для сябе творы, якія вытрымалі выпрабаванне часам.



«Псалтыр» Францыска Скарыны — первая печатная книга в восточнославянском мире, изданная 6 августа 1517 года в Праге. Это произведение стало основой для развития белорусского книгопечатания.



«Сон на кургане» — драматычная паэма Янкі Купалы, завершаная 8 жніўня 1910 года ў Санкт-Пецярбургу. Упершыню надрукавана ў літаратурным альманаху «Маладая Беларусь» (серыя 1, сшытак 1) у 1912 годзе. Мае аўтарскае прысвячэнне: «Памяці свайго бацькі і брата». Чарнавы аўтограф паэмы захоўваецца ў Літаратурным музеі Янкі Купалы. Паэма стала новым па жанры творам у беларускай літаратуры, якая дагэтуль развівалася пераважна ў рэчышчы канкрэтнага, рэальна-прадметнага адлюстравання жыцця. Паэма адметна сваім маштабным рамантычным мысленнем, умоўна—фантастычнымі вобразамі.




Тэматычна зборнік «Спадчына» складаюць вершы, прысвечаныя першай сусветнай вайне; тэме жыцця беларускай вёскі; філасофскія санеты, дзе па-мастацку арыгінальна акрэслены адвечныя пытанні чалавечага быцця – дабро і зло, жыццё і смерць, здрада і помста; вершы грамадзянскай публіцыстычнай лірыкі, у якіх вырашаецца праблема гістарычнага лёсу краіны; лірычныя творы інтымнай тэматыкі, дзе тэма кахання і маральна-этычнай місіі чалавека цесна пераплецены; творы, пазначаныя ўплывам фальклору, у якіх распрацоўваецца праблема “чалавек і свабода”.



У **другой частцы трылогіі — аповесці «У глыбі Палесся»** — Андрэй Лабановіч уключаецца ў грамадскае жыццё, прымае ўдзел у сялянскіх хваляваннях, узаемадзейніч ае з падпольнай рэвалюцыйнай арганізацыяй у Пінску. Дзеянне гэтай часткі адбываецца ў 1904—1905 гадах.




Твор завершаны ў 1913 г. Упершыню апублікаваны ў газеце «Беларусь» у 1920 г. У аснове сюжэта — легенда пра ўзнікненне г. Магілёва, пра асілка Машэку, нібыта пахаванага на гары з назваю Магіла льва, або Машэкава гара. Легенда паслужыла толькі сюжэтнай канвой твора. Вобраз Машэкі атрымаў прынцыпова розную ад фальклорнай інтэрпрэтацыю. Аўтар разглядае праблему гістарычнай крыўды народа і ад яе пераходзіць на вырашэнне праблемы ўзаемаадносін выключнай асобы і грамады.



Янка Маўр творча засвойваў традыцыі Жуля Верна і Фенімора Купера, Майн Рыда і Луі Бусенара, Аляксандра Дзюма і Герберта Уэлса. Яго заслужана лічаць заснавальнікам прыгодніцкага жанру ў нашым прыгожым пісьменстве, стваральнікам і класікам беларускай дзіцячай літаратуры.

Ужо першая аповесць тагачаснага 40-гадовага настаўніка гісторыі і геаграфіі “Чалавек ідзе”, якая плённа спалучала пазнавальнасць і прыгодніцтва, стала бестсэлерам. У ёй аўтар знайшоў удалы мастацкі ход – першабытны чалавек, нібыта дзіця, усё спазнае ўпершыню: распальвае вогнішча, палюе на драпежнага звера, на ягоных вуснах першы раз з’яўляецца ўсмешка, а на вачах – слязінка...




Напісаны ў 1930-1931 гг. твор, які складаецца з 36 частак, прысвечаны калектывізацыі і адлюстроўвае драматызм яе правядзення для вёскі. У першым аўтарскім варыянце аповесць была востраактуальна для свайго часу і выходзіла на праблемы агульначалавечага быцця, апярэдзіўшы ў некаторых важных аспектах асэнсавання тагачасных падзей "Паднятую цаліну" М. Шолахава і "Краіну Муравію" А. Твардоўскага.




Галоўныя героі аповесці - медзведзяня Мішка, казёл Барадаты і сабака Жук, якія думаюць, разважаюць і паводзяцца зусім як людзі.

Аўтар з гумарам апісвае прыгоды сяброў на грамадзянская вайне. Аповесць насычаная вясёлымі, смешнымі і разам з тым павучальнымі гісторыямі.




«Міколка-паравоз» - шырока вядомая аповесць народнага пісьменніка Беларусі Міхася Лынькова пра жыццё і прыгоды хлопчыка Міколкі, сына чыгуначніка.



Хмары на світанні" — першая кніга рамана "Мінскі напрамак" лаўрэата Ленінскай прэміі, народнага пісьменніка Беларусі І. Мележа. Аўтар, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, выкарыстаўшы асабістыя ўспаміны і ўспаміны многіх удзельнікаў баёў, вывучыўшы гістарычныя матэрыялы, з вялікім майстэрствам і глыбінёю расказвае аб падзеях 1944 года, якія папярэднічалі вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.


"Мінск за небакраем" і "Будучыня з намі" — другая і трэцяя кнігі рамана "Мінскі напрамак". Падзеі, апісаныя ў гэтых кнігах, ахопліваюць час, калі воіны Савецкай Арміі і беларускія партызаны, праяўляючы незвычайны масавы гераізм, мужнасць, разграмілі летам 1944 года нямецка-фашысцкія войскі і канчаткова вызвалілі родную Беларусь.

75



Імя Івана Мележа застанецца ў нацыянальнай і сусветнай літаратуры дзякуючы створанай ім эпічнай «Палескай хроніцы» — глыбокаму філасофска-мастацкаму асэнсаванню жыцця Беларусі ў пераломныя 1920—1930-я гады. Раман «Людзі на балоце», які распачынае хроніку, уводзіць чытача ў беларускі свет вёскі Курані, дзе здзяйсняецца драма жыцця і кахання галоўных герояў. Сам Мележ невыпадкова называў свой твор «лірычным раманам». Не прачытаўшы «Людзей на балоце», сапраўды немагчыма спасцігнуць душу беларуса, ягоны нацыянальны характар, мары і памкненні.

65



Прапанаваныя аповесці прызнанага майстра ваеннай прозы Васіля Быкава апісваюць асобныя эпізоды з франтавога жыцця савецкіх байцоў. На першы погляд, у іх няма нічога выключнага – такія падзеі дзе-нідзе адбываліся штодня і звесткі пра іх нават не траплялі ў вайсковыя сводкі. Але кожны з герояў узрастае да асабістага подзвігу, які і стане маленькай часцінкай Вялікай Перамогі.




Раман «Вецер у соснах» прысвечаны тэме партызанскай барацьбы на Палессі. Яго трэба лічыць працягам кнігі «Сасна пры дарозе», але ў той жа самы час – гэта самастойны твор, бо ў яго прыйшлі новыя праблемы і новыя героі.




Адзін толькі радок у летапісе, які апавядае пра з’яўленне ілжэхрыста ў Гародні – і з яго, бы з насення, вырастае гісторыя Юрася Братчыка, спярша пабітага жыццём бадзяжнага актора і махляра, а потым – народнага заступніка, змагара, філосафа. Уладзімір Караткевіч (1930–1984), які пісаў раман у эпоху ваяўнічага атэізму, здолеў расквеціць свой твор цытатамі з Евангелля і апісаннямі цудаў, якія творыць гарадзенскі Хрыстос. Не забыўся пісьменнік і пра цмокаў, што насялялі калісьці Лепельскае возера.

Урэшце Караткевіч прывёў свайго героя ў рай, які вельмі нагадвае заможны беларускі падворак…



У пачатку вайны беларускую вёску занялі немцы. Адданаму старшыні загадалі стварыць партызанскі рух. Праз канфлікт ён забіў урача, пакутуючы пасля ўчынку. Намеснік дапамагаў людзям выжыць у акупацыі.




Цікавы, захапляльны сюжэт адразу заваюе ўвагу юнага чытача — аповед у «Прыгодах Бульбобаў» вядзецца ад імя... сабачанят. З мяккім гумарам аўтар расказвае, як маленькія істоты адкрываюць для сябе такое вялікае і складанае жыццё.




Праз сваю жыццясцвярджальную творчасць У.Караткевіч стварыў яркі вобраз “шляхецкай” Беларусі, мастацкі летапіс нацыянальнай гісторыі, прывабнай для саміх беларусаў і не толькі. Пісьменнік імкнуўся, каб не было белых плямаў у нашай памяці і свядомасці.

Творы У. Караткевіча, вобразы яго герояў захаплялі сваёй сярэднявечнай рамантыкай, фарміравалі ў новага пакалення свядомасць, новае стаўленне да сваёй гістарычнай спадчыны. У.Арлоў пра свае студэнцкія гады напісаў: “Сапраўднае мінулае Радзімы мы пачыналі адкрываць для сябе дзякуючы кнігам Ул. Караткевіча, што якраз тады прыйшлі да чытача. Яны сталіся акном у свет зусім іншай гісторыі, той, якой можна было ганарыцца”.

45



Аповесць Васіля Быкава «Знак бяды» — адзін з самых глыбокіх і праўдзівых твораў пра вайну і міжваенны перыяд на тэрыторыі Беларусі. Сімвалізм і псіхалагічная дакладнасць персанажаў, бескампрамісны погляд на трагічныя падзеі робяць твор актуальным і цікавым для самага шырокага кола чытачоў.



У рамане ўзнаўляюцца падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Галоўны герой твора, камандзір Чырвонай Арміі Агееў па волі франтавога лёсу апынаецца ў невялікім мястэчку на поўдні Беларусі. Цяжка паранены, ён змушаны пайсці ў падполле, каб зноў змагацца з фашыстамі. У творы падзеі 1941 года пераплятаюцца з сучаснасцю і яе няпростымі праблемамі, якімі так ці інакш вымушаны займацца Агееў.



У рамане "Меч князя Вячкі" адлюстравана гераічная барацьба гараджан старажытнага Полацка з тэўтонскімі рыцарамі-крыжаносцамі. Твор прасякнуты ідэяй аб неабходнасці аб'яднання славянскіх народаў, а таксама іх суседзяў — літоўцаў, латышоў, эстонцаў — дзеля таго, каб супрацьстаяць ворагу.